Весці БДПУ. Серыя 2. 2020. № 2. С. 28–34

УДК 27-4:27-442.47

# КАМЕНТАРЫІ ЗАХОДНЕЕЎРАПЕЙСКІХ ФІЛОСАФАЎ І ХРЫСЦІЯНСКІХ БАГАСЛОВАЎ XIX ст. АБ ІНСТЫТУЦЕ ПАСТУ

**У. М. Завальнюк,**
*кандыдат гістарычных навук,*
*ксёндз-магістр, настаяцель Мінскага*
*касцёла св. Сымона і св. Алены*

Паступіў у рэдакцыю 07.04.20

UDC 27-4:27-442.47

# COMMENTS OF WESTERN EUROPEAN PHILOSOPHERS AND CHRISTIAN THEOLOGIANS IN THE XIX CENTURY ON THE INSTITUTE OF FASTING

**U. Zavalnyuk,**
*PhD in History, Roman Catholic*
*priest-master, abbot of Minsk Cathedral*
*of Saint Simon and Helen*

Received on 07.04.20

Разглядаецца тэма пасніцтва ў заходнееўрапейскай філасофіі і хрысціянскім багаслоўі XIX ст. Тэорыя пазнання становіцца асновай філасофіі, што прывяло да размежавання такіх паняццяў, як навука і вера. Заходнееўрапейскія багасловы, філосафы, даследчыкі гісторыі хрысціянства пад ціскам лібералізму вымушаны былі шукаць адказы на выклікі часу. У перыяд палітычнага супрацьстаяння ў XIX ст. навукоўцы і царкоўная супольнасць вымушаны былі вырашаць надзённыя праблемныя пытанні Царквы і рэлігіі.
Асвятленне тэмы пасніцтва і аскетыкі ў гэты час насіла фрагментарны характар, абмяркоўвалася і праходзіла штрыхамі ў агульным кантэксце багаслоўскіх трактатаў. У працах даследчыкаў тэма пасніцтва і аскезы ў хрысціянстве вывучалася і папулярызавалася як пераацэнка і пераарыентаванне духоўнага жыцця па форме і змесце. Прадстаўнікі шматлікіх багаслоўскіх школ разглядаемага перыяду прыходзяць да кансэнсусу па пытаннях рэлігійнага жыцця, аснову якога складалі вучэнне, асабісты прыклад і Новы Запавет Ісуса Хрыста.

*Ключавыя словы:* аскетыка, багаслоўе, гістарыяграфія, Заходняя Еўропа, пост, рэлігія, рамантызм, Святое Пісанне, Святое Паданне, тэалогія, філасофія, хрысціянства, Царква.

The article considers the topic of fasting in Western European philosophy and Christian theology of the XIX century. The theory of cognition becomes a base of philosophy which brought to limitation of such notions as science and belief. Western European theologians, philosophers, researchers of history of Christianity under the pressure of liberalism had to search for the answers to the challenges of that time. In the period of political opposition in the XIX century scientists and church community had to solve everyday problems of the Church and religion.
The interpretation of the topic of fasting and asceticism at that time had fragmentary character, it was discussed in the general context of theological treatises. In the works of researchers the topic of fasting and asceticism in Christianity was studied and popularized as reevaluation and reorienting of spiritual life in form and content. Representatives of numerous theological schools of the considered period come to the consensus on the questions of religious life based on the learning, personal example and New Testament of Jesus Christ.

*Keywords:* asceticism, theology, historiography, Western Europe, fast, religion, romanticism, Holy Scripture, Sacred Legend, philosophy, Christianity, Church.

*Уводзіны.* Вялікая французская рэвалюцыя прывяла да істотнай трансфармацыі сацыяльных і палітычных сістэм, грамадскай самасвядомасці, стварыла новую «духоўную прастору» ў большасці краін Еўропы. Ідэі натуральнага права і ўсеагульнай роўнасці заклалі практычную аснову для ўмацавання ліберальных тэндэнцый у еўрапейскай цывілізацыі. Падчас рэвалюцыі адбыўся падзел Царквы, дзяржавы і культуры, што стала прычынай паглыблення наяўных рознагалоссяў. Варта адзначыць, што ў пэўных слаях грамадства XIX ст. ліберальны рух атрымаў шырокую падтрымку і стаў рэальнай небяспекай для захавання стабільнага становішча і існавання Царквы.

На працягу стагоддзяў Царква і рэлігія служылі асновай умацавання і аб'яднання грамадства. Зараз жа яны сталі выконваць выключна «сацыяльныя» функцыі (абрады хрышчэння, канфірмацыі, вянчання і адпявання), служылі дадаткам і прыладай абслугоўвання грамадскай сферы жыцця [1, с. 332].

Аднак, як лічыць гісторык царквы Й. Лорц, праследаванні хрысціянства, асабліва падчас рэвалюцыйных узрушэнняў, сталі яе выратаваннем, менавіта яны спарадзілі новую плеяду пакутнікаў. Актывізавалася дзейнасць Царквы: за перыядам доўгай унутранай дэстабілізацыі настаў час рашучых дзеянняў. Непахіснасная вера, цярпенне, душэўныя і фізічныя мукі пакутнікаў сталі пачаткам абнаўлення хрысціянства [1, с. 311].

Важнейшы фактар адраджэння хрысціянства ў Заходняй Еўропе – гэта яго згуртаванне вакол Каталіцкай Царквы на чале з Рымам. Лорц адзначаў, што менавіта ўстанаўленне вяршэнства Рымскай курыі паклала канец самастойнасці прывілеяваных епіскапатаў у Францыі і Германіі, кіруемых часта свецкай уладай, і пахіснула ўстойлівасць магутных еўрапейскіх Цэркваў. Утварыўся своеасаблівы вакуум, тут жа запоўнены Рымам, пры гэтым паслабленне царкоўнай улады біскупаў толькі спрыяла ўзмацненню аўтарытэту і ўплыву Рымскай курыі [1, с. 311–315].

Рымская курыя, умацаваўшы свае пазіцыі і ўплыў, вызначыла задачы развіцця Царквы, якая ў сваёй дзейнасці не магла абмежавацца вырашэннем толькі прыватных пытанняў. Неабходна было ўзнавіць рэлігійныя асновы. Пры гэтым галоўным кірункам іх укаранення стала місіянерская дзейнасць: Царкве неабходна было знайсці сваё месца ў жыцці грамадства, пракласці шляхі да прымірэння з новай культурай, богам для якой з'яўлялася «навука» з яе рацыяналізмам.

*Асноўная частка.* Гістарыяграфію гісторыі хрысціянства гэтага перыяду дэталёва адлюстравалі ў сваіх

працах Б. Хеглунд [2], Ф. Шафф [3], О. Р. Джордан Амэн [4], А. П. Лебедзеў [5]. Важнейшыя тэндэнцыі развіцця Царквы і багаслоўя вызначаны ў рэлігійных даследаваннях, публіцыстыцы тэалагічных цэнтраў і універсітэцкіх кафедраў нямецкіх зямель, дзе сканцэнтравалася інтэлектуальнае жыццё хрысціянскай Еўропы. Адзначым, што ў Германіі Царкве не давялося адчуць на сабе рэвалюцыйныя ўзрушэнні і гвалтоўнае звяржэнне. Гэты перыяд у краіне можна ахарактарызаваць як метамарфозу культуры, нешта накшталт другой Рэфармацыі, якая аб'яднала нацыю яшчэ да дасягнення ёю эканамічнага і палітычнага адзінства.

У першай палове XIX ст. у Германіі хуткімі тэмпамі развівалася інтэлектуальнае жыццё. Нацыянальны геній дасягнуў свайго апагея, як гэта адбылося ў XVIII ст. у Францыі. Толькі цяпер гэта быў рамантызм, які панаваў як літаратурнае, філасофска-эстэтычнае светаўспрыманне адукаванай часткі грамадства. Ён нарадзіўся ў навучальных і багаслоўскіх установах Йены. Гэты час вызначаецца дзейнасцю такіх вялікіх мысліцелей, як І. Фіхтэ, Г. Гегель, Ф. Шэлінг, Й. В. фон Гётэ, Ф. Шлейермахер. Нямецкія рамантыкі дэталёва вывучалі праблемныя пытанні светабудовы, рэлігіі, хрысціянства, спарадычна давалі каментарыі па тэме пасніцтва.

І. Фіхтэ і Ф. Шэлінг амаль адначасова даследавалі ў сваіх працах блізкія ў агульных рысах філасофскія сістэмы. Агульным у іх было імкненне ліквідаваць анталагічныя і гнасеалагічныя супрацьлегласці як у вучэнні пра Абсалют, так і пра ўяўленне ў самапазнанне Бога. Распрацоўка адзначаных тэм прыводзіць абодвух філосафаў да стварэння спекулятыўных сістэм, якія прэтэндуюць на анатаміраванне ўсёй светабудовы, у дадзеным кантэксце – Бога [6, с. 116]. Светапоглядныя адрозненні ў падыходах прыводзяць Фіхтэ і Шэлінга да дыскусій, пры гэтым кожны з іх абапіраўся на факты, феномены, тэорыі, з дапамогай якіх даводзілася каменціраваць і абгрунтоўваць сваё разуменне пасніцтва.

Так, Фіхтэ ў сваёй галоўнай працы «Сістэма вучэння пра норавы паводле прынцыпаў навуканавучання» пры раскрыцці тэмы забароны, аб'ядноўвае пасніцтва, празмернасць, нецнатлівасць і адносіць іх да крайнасцей, накіраваных супраць самазахавання цела, што «апускаюць яго (*цела.* – У. З.) глыбока ў матэрыю і адымаюць усялякую здольнасць лунаць»... [7, с. 261].

Дэталёва даследуючы мітраізм у вядомай працы «Філасофія міфалогіі», Шэлінг аб'ядноўвае ў адну групу «пасты, бясшлюбнасць, чалавечыя ахвяры», адносіць да выпрабаванняў і характарызуе іх «не проста строгімі ці суровымі, але жорсткімі, а іншы раз і небяспечнымі для самога жыцця, абставін, якім павінен быў падвергнуць сябе, жадаючы атрымаць пасвячэнне ў Mithriaca [8, т. 2, с. 179].

Наперакор Шэлінгу, які цалкам супрацьпастаўляў «разумовае адмаўленне» звычайнаму разважліваму мысленню, што адрознівала прадметы і давала ім вызначэнне ў цвёрдых паняццях, Г. В. Ф. Гегель адзначаў, што «хрысціянства як абсалютная рэлігія прызнае Бога ў безумоўным адзінстве або прымірэнні бясконцага і канчатковага». Гегель дэталёва абгрунтоўваў у сваіх чытаннях праблемы філасофіі рэлігіі, абстрактны сэнс галоўных хрысціянскіх догматаў – тройцы, грэхападзення, адкуплення [9, с. 220]. Згадваючы пра малітву і пост, Гегель у працы «Філасофія рэлігіі» каменціраваў, што «Ісус прымаў і тое, і іншае – альбо цалкам аб'ектыўныя, прадпісаныя абавязкі, альбо дзеянні, заснаваныя на пэўнай патрэбнасці. Іх нельга ўяўляць сабе як маральны абавязак, паколькі яны не мяркуюць супрацьпастаўлення, якое можна было б аб'яднаць у паняцці. Ісус ганьбіць і ў тым і ў іншым бачнасць набожнасці, у прыватнасці, у малітве залішняе шматслоўе, з дапамогай якога ёй надаецца характар доўгу і абавязковага яго выканання. Значэнне пасту залежыць, на думку Ісуса (Мацей. IX, 15), − каменціруе Гегель, − ад пачуцця, якое ляжыць у яго аснове, ад патрэбы, якая прымушае пасціцца. Выключаючы з малітвы ўсё нячыстае, Ісус, разам з тым, вучыць, як трэба маліцца. Аднак праўдзівасць малітвы павінна разглядацца ў іншай сувязі» [8, с. 115, 116].

Далей Г. В. Фрыдрых указвае на пасніцтва як на станоўчы фактар духоўнага росту, што практыкаваў і прадпісваў Ісус. Адзначым, што Гегель паказаў на абрад пасту, спаслаўшыся на евангельскую прытчу пра жаніха, у якой «сёй-той з вучняў Іаана і фарысеяў заўважыў, што яны часта пасцяць, а сябры Ісуса не». На іх пытанне Ісус адказаў: «Якая прычына магла б прывесці іх да смутку? Блізкі дзень, калі адбяруць у іх настаўніка, як аднялі яго ў вас, – тады і ў іх надыдзе час пасту! І далей Гегель маркіруе, што Хрыстос раскрыў, паказаў іншы змест пасту – «...не ахвяра, а праўда падабаюцца мне», тым самым паказаў і напоўніў пост духоўнай складовай [8, с. 49].

Раней у працы «Пазітыўнасці хрысціянскай рэлігіі» Гегель пашыраў гэты каментарый: «Наша публічная рэлігія, як і многае ў нашых звычаях, адносіцца да правіл пачуццяў: смутак, посная ежа падчас пасту, уборы і задавальненні на Вялікдзень. Калі ж лічыць гэты парадак усеагульным, то ў выніку так шмат пустога і безжыццёвага ў нашых абрадах, што ўсякае пачуццё ўжо выкаранена з іх, але правіла ўсё яшчэ загадвае перажываць ранейшае ўспрыманне». У гэтым філосаф знайшоў істотныя, на яго погляд, памылкі. Гегель лічыў, што загады Царквы, «з дапамогай якіх мы «павінны» аказваць гонар бажаству, заваёўваючы яго прыхільнасць, дзесьці ў нас саміх спараджалі такі настрой і накіраванасць духу, якіх Царква патрабуе ад нас... і што адраджала ў хрысціянскай царкве характэрную якасць іўдзейскай рэлігіі – рабскую пакорлівасць закону, тады як хрысціяне не стамляюцца віншаваць адзін аднаго з нагоды вызвалення ад такога рабства. Таму ён бачыў патрэбу ў пераасэнсаванні і іншым духоўным напаўненні пасту [11, с. 171].

Тэарэтычныя асновы вучэння Ф. Шлейермахера змешчаны ў даследаванні «Дыялектыка», якое было напісана на падставе лекцый і выдадзена пасмяротна. Філасофія, паводле Ф. Шлейермахера, павінна паказаць, якім чынам мысленне ў якасці пазнання можа набліжацца да свайго ідэалу.

Згодна з перакананнямі Ф. Шлейермахера, Бог неспазнавальны. Яго філасофія рэлігіі грунтуецца не на тэарэтычным і практычным, а на эстэтычным мысленні. Калі Бог не можа быць спазнаны, то і філасофія рэлігіі з'яўляецца не вучэннем пра Бога, а аб рэлігійным пачуцці. Багаслоў выказаў ідэю асобы, выкарыстоўваючы для яе даследавання рэлігійную абраднасць, аскетыку, пасніцтва. Раскрываючы тэму асобы і рэлігіі, Ф. Шлейермахер прыйшоў да высновы пра неабходнасць разумець і падзяляць крывадушнасць і чысціню веры. Сказаныя крывадушнікам словы, вы-

конваемыя ім абрады, дабрачыннасць з'яўляюцца павер'ямі, якія мы павінны прызнаць бязбожнымі.

Далей багаслоў канкрэтызуе, што мы не павінны змешваць паданні і міфы з дабрачынным імкненнем рэлігійных душ. Тое і іншае адрозніваецца сапраўды вельмі лёгка; бо кожны рэлігійны чалавек стварае для сябе ўласную аскетыку, у якой ён мае патрэбу, і не шукае якой-небудзь нормы, акрамя той, якую ён носіць у сабе. Марнаслоў і крывадушнік строга трымаецца дадзенага звонку, традыцыйна і рупліва выконвае ўсё гэта, як нешта агульнаабавязковае і святое [12, с. 98].

Гісторыкі навукі адзначаюць, што росквіт рамантызму ўяўляў для хрысціянства Германіі сур'ёзную праблему. Ваяўнічыя рамантыкі разглядалі рэлігійныя перакананні і абрады каталікоў у адзіным шэрагу з індыйскімі і егіпецкімі язычніцкімі культамі, якія трэба адкінуць усе разам як міфы. Гэта заклікала каталіцкіх багасловаў і філосафаў актывізавацца да правядзення дыскусіі, якая расцягнулася на шмат гадоў. Больш за іншых для адраджэння рэпутацыі каталіцтва ў Германіі зрабіў Ёган Зайлер. Працы багаслова займаюць каля сарака тамоў, а ў ліку яго чытачоў былі і каталікі, і пратэстанты.

Зайлер парваў са схаластыкай XVIII ст., далёкай ад патрэб часу, вывучаў працы каталікоў, пратэстантаў і няверуючых. Багаслоў апярэдзіў свой час і прадугадаў з'яўленне знакамітай Цюбінгенскай школы. Яму ўдалося спыніць наступленне рацыяналізму і стварыць паміж пратэстантамі і каталікамі атмасферу мірнага саіснавання [4, с. 325]. Значна паўплывала на яго творчасць знаходжанне ў ордэне езуітаў. Анатаваны пераклад Зайлера «Перайманне ў Хрыста» (Мюнхен, 1794) і «Практыкаванні духу для станаўлення і развіцця святых намераў і жыцця» (Мангейм, 1799) будуць прынятыя каталіцкай царквой Германіі ў якасці праграмных палажэнняў для выхавання духавенства. Гэтыя пастулаты змяшчалі стабільны план Практыкаванняў, прытрымоўваліся мадэлі св. І. Лаёлы: пачатак і падстава, роздум аб трох грахах, роздум пра Цара нябеснага, аб трох ступенях пакоры і заключнае сузіранне дзеля набыцця любові Божай [13, с. 504, 505].

Чалавек, выконваючы Практыкаванні, павінен прызнаць сваю грахоўнасць і выйсці з яе, прыняць Хрыста і ўпусціць яго ў сваё жыццё, злучыцца з Хрыстом у пакуце, смерці і ўваскрашэнні. Багаслоў прапанаваў радыкальны шлях – «усё або нічога». Лаёла і Ё.Зайлер лічылі, што выратаванне дасягаецца верай і дзейнасцю пры іх спалучэнні. Важным фактарам ў выхаванні хрысціянскіх дабрачыннасцей, на думку абодвух, былі аскеза і пост, але ў разумным прымяненні. Зайлер цытаваў Лаёлу: «Душа і цела дадзены нам Творцам і Богам Нашым, і перад Ім трэба будзе трымаць справаздачу за ўсё. Таму не дазваляйце сваёй цялеснай прыродзе слабець, бо калі яна будзе нямоглай, то не зможа дзейнічаць як прырода ўнутраная. Таму, хоць я калісьці вельмі хваліў пасты са строгім устрыманнем і рашучай адмовай ад многіх звычайных відаў ежы і на працягу пэўнага часу гэта мяне задавальняла, у будучым ухваляць іх я не буду, бо бачу, што з-за такіх пастоў і ўстрымання страўнік не можа працаваць натуральна і нават не здольны пераварваць ні адной са звычайных мясных страў, ні іншую ежу належным чынам, падтрымліваючы цела чалавека. Наадварот, варта адшукваць усе сродкі, каб умацаваць яго, ужываючы любыя дазволеныя стравы, і так часта, як гэта карысна, але не крыўдзячы пры гэтым бліжняга. Бо мы павінны любіць сваё цела ў той меры, у якой яно паслушнае і дапамагае душы, а яна, маючы такую паслухмянасць і дапамогу, больш паспяхова рыхтуецца для служэння Творцу і Госпаду нашаму і да Яго праслаўлення» [14, с. 368].

Нараўне з Зайлерам развіваў і папулярызаваў каталіцкае багаслоўе Ёган Ёзаф Гёрас (1776–1848), якога ў XIX ст. прызналі «найбуйнейшай фігурай у аналах нямецкага каталіцкага багаслоўя». Свецкі чалавек, які вярнуўся да рыма-каталіцтва пасля перыяду захаплення рацыяналістычнымі вучэннямі, набыў вядомасць лекцыямі, прысвечанымі містыцы, якія чытаў ў Мюнхенскім універсітэце. Пазней гэтыя лекцыі сталі асновай для яго чатырохтомнай працы Christliche Mystik (1836–1842). Лекцыі і працы Гёраса рэанімавалі, узбуджалі цікавасць да містычных пытанняў.

Багаслоў вылучаў тры тыпы містыкі: боскую, натуральную і д'ябальскую. Ён лічыў, што да злучэння і сувязі з Богам можа прывесці толькі боская містыка. Натуральная містыка – гэта ўсведамленне чалавекам таямніц і схаваных сіл матэрыяльнай прыроды; д'ябальская містыка ўсталёўвае свайго кшталту кантакт і падпарадкаванасць уплыву дэманаў. У кантэксце вышэйадзначанага даследавання гісторыі стыгматызацыі Францыска Асізскага Гёрас закрануў тэматыку посніцтва. Багаслоў звярнуў увагу на практычныя дзеянні Францыска − «захаванне ў гонар Міхаіла саракадзённага пасту і малітвы», што выклікалі частыя і працяглыя экстазы, спрыялі паяднанню з Богам [15, с. 815]. Фізіялагічныя тэорыі Гёраса сёння прызнаны негрунтоўнымі, а яго канцэпцыя містыкі тэарэтычна нявытрыманай. Аднак уплыў яго разважанняў і поглядаў на багасловаў, а таксама вернікаў заставаўся даволі моцным яшчэ доўгі час пасля яго смерці [4, с. 326].

Пратэстанцкае багаслоўе XIX ст. прадстаўлена такімі аўтарытэтнымі даследчыкамі, як А. Неандэр, Ф. Хрысціян Баур, А. Гарнак, Д. Ф. Штраус. Спрыяльныя ўмовы, што паўплывалі на ажыўленне рэлігійнай свядомасці пратэстанцкай Германіі, − гэта натуральная рэакцыя з боку рэлігійнага духу супраць нявер'я папярэдняга стагоддзя, частка плённай дзейнасці філосафаў, гісторыкаў і багасловаў-рамантыкаў.

Пад уплывам названых умоў у пратэстанцкім багаслоўі Германіі пачатку XIX ст. адбываўся працэс павышанай увагі да рэлігіі. З гэтага ажыўлення нарадзілася знакамітая ў свой час школа царкоўна-гістарычнай навукі А. Неандара, празванага пратэстантамі «бацькам найноўшай царкоўнай гісторыі». Гісторыкі Германіі прызналі яго метад гістарыяграфічнага прыёму, які заключаўся ў наступным: суб'ектыўнае стаўленне гісторыка ўбудоўваецца ў гарманічную сувязь з фактычнай гістарычнай ісцінай, на якую ўказвае вывучэнне крыніц. Неандар прапанаваў новы напрамак царкоўна-гістарычнага прагматызму [5, с. 338]. Варта адзначыць, што прагматыкі закраналі посніцтва эпізадычна.

Адначасова са школай Неандара ў Германіі ўзнікла і развілася Рацыяналістычная школа, гісторыкі якой дэталёва даследавалі тэмы паходжання хрысціянства, састаўленне новазапаветнага канона, развіццё царкоўна-гістарычнага жыцця. Яе знакамітыя прадстаўнікі выйшлі з Цюбінгенскага ўніверсітэта, а заснавальнікам гэтага кірунку з'яўляецца Фердынанд Хрысціян Бауэр.

У сваіх працах Бауэр дэталёва асвяціў багаслоўе і гісторыю хрысціянскай царквы. Яго манаграфіі «Гісторыя маніхейства» (1831), «Гісторыя хрысціянскага Гносіса» (1835), «Вучэнне аб Траічнасці і ўчалавечанні Бога» (тры тамы, 1841–3) нямецкія гістарыёграфы адносяць да галоўных царкоўна-гістарычных даследаванняў. Аўтар так па-майстэрску раскрыў гістарычнае развіццё Царквы, што не засталося ні аднаго важнага аспекта царкоўнай гісторыі, які не ўвайшоў бы так ці інакш у сістэму як звяно, патрэбнае для гармоніі цэлага. Пры гэтым дзейсныя прынцыпы адлюстроўваліся не ў характары асобнага чалавека, а ў сукупнасці з гістарычнымі данымі ўвогуле. У сістэме Бауэра яго імкненні ўсюды знаходзілі сэнс, які хаваўся пад фактамі, што прыводзілі яго да заслугоўваючых поўнай увагі высноў. Погляды Бауэра не знайшлі прыхільнікаў, але яго тэндэнцыі растлумачыць паходжанне хрысціянства і развіццё Царквы шляхам чыста натуральным надоўга захаваліся ў свядомасці вернікаў.

Прадаўжальнікам поглядаў мысліцеля ў нямецкай багаслоўскай навуцы з'яўляецца Адольф Гарнак. Яго даследаванне «Гісторыя догматаў» (дакладней − падручнік па гісторыі догматаў) − рашучая і шматбаковая спроба растлумачыць паходжанне хрысціянства і развіццё Царквы з пункту гледжання рацыяналістычных поглядаў. Гарнак, спасылаючыся на працы хрысціянскіх багасловаў (I−IV стст.), канстатаваў, што менавіта ўстаноўленыя догматы сталі зборам правілаў, задалі форму, змест, вызначылі паспяховае станаўленне і развіццё хрысціянства. Дэталізуючы правілы і абрады хрысціянства, Гарнак закрануў і пасніцтва, напісаў да гэтай тэмы каментарыі. Так, багаслоў, аналізуючы тэксты Святога Пісання і Святога Падання, адзначаў, што шанаванне Бога ў старажытнай Царкве было прынцыповым, але яно павінна быць чыста духоўным, без абрадаў. Усякае набажэнства лічылася духоўнай ахвярай (падзякай), якая суправаджалася пастом і справамі міласэрнасці [16, с. 31].

Пост як атрыбут рэлігіі Новага Запавету захоўваўся, але, на думку А. Гарнака, выступаў у новай якасці і змесце: «У хрышчэнні Бог дарує без задавальнення, але ад ахрышчанага Ён патрабуе вядомага наталення, якое затым залічваецца яму як заслуга. І ахрышчаны сапраўды можа даць такую радасць, якая служыць самаўдасканаленню і ахоўвае яго ад грахоў. Каштоўныя толькі такія подзвігі, што здзяйсняюцца ў стане ласкі (любові, пасля адпушчэння); аднак некаторую цану маюць і справы (малітва, пост, міласціна). Гарнак тым самым разглядае пост як фактар узмацнення намераў. Новы змест пасту ў хрысціянстве − яго дасканалая чысціня. Духоўны змест складае, напаўняе пасніцтва, узорам чаго на думку даследчыка з'яўлялася практыка манаства [17, с. 153].

Паслядоўнік і вучань прафесара Х. Бауэра філосаф, гісторык, тэолаг і публіцыст Давід Фрыдрых Штраус доўга супрацiўляўся рацыяналістычнаму ўплыву свайго настаўніка, але вывучэнне прац Шлейермахера і асабліва Гегеля пахіснулі яго светаўспрыманне. Абапіраючыся на прынцыпы гегелеўскай філасофіі падчас даследавання Евангелляў, Штраус не адмаўляў гістарычнага існавання асобы Ісуса, але знаходзіў, што большая частка ўяўленняў пра яго (Боскасць Ісуса, Беззаганнае зачацце, Уваскрасенне, Ушэсце) мае пазнейшае паходжанне. Таму ён спрабаваў высветліць, з якіх (грэчаскіх, яўрэйскіх і ўсходніх) элементаў яны склаліся.

Выданне кнігі «Жыццё Ісуса» ў 1835 г. зрабіла яе аўтара, малавядомага Цюбінгенскага тэолага Д. Ф. Штрауса, еўрапейскай знакамітасцю. Адзначым, што, на думку многіх даследчыкаў, гэта папулярнасць была хутчэй знеслаўляльнай. Выданне кнігі «Жыццё Ісуса» адзначыла раскол гегелеўскай школы, у якой вызначылася правае крыло, прадстаўленае «вучнямі і сябрамі», лаяльнымі да даследаванняў Гегеля і шэрагу яго прынцыпаў, а таксама цэнтр і левае гегельянства [18, с. 7].

У каментарыях да тэмы пасніцтва Штраус падзяляў меркаванне Айцоў Царквы (Васілія Вялікага, Грыгорыя Багаслова, Грыгорыя Ніскага, Іаана Златавуста) і паказваў, што рэлігія Новага Запавету нясе ў сабе іншае напаўненне пасту, вызначае яго духоўны і маральны стан. Так, у главе 35 «Адносіны Ісуса да закона Майсея» Давід Фрыдрых падкрэсліў, што «несумяшчальнасць са старым іўдаізмам бачна з таго, як Ісус выказваўся па пытанні пра пасты (Мц. 9: 14–17). Іўдзеі здзіўляліся, што ён, у супрацьлегласць Яну Хрысціцелю, не патрабаваў ад сваіх вучняў часта пасціцца; бо кожны іудзей, які імкнуўся праслаўціцца святым, падобна да фарысеяў і ясеяў, стараўся дасягнуць мэты тым, што, акрамя прадпісанага Законам (Леў. 16:29) штогадовага пасту ў дзень ачышчэння, накладваў на сябе яшчэ розныя добраахвотныя ахвяры. Задаволены сваёй праведнасцю, фарысей у прытчы Ісуса (Лк. 18:12) пахваляецца тым, што ён пасціцца два разы на тыдзень. Штраус жа адзначае, што Ісус не абмяжоўваўся звычайным выкрыццём (Мц. 06:16) крывадушнасці фарысеяў, што пасціліся па патрабаванні. Ён расказвае (Мц. 9: 15–17) прытчу пра старую адзежу, на якую ніхто не стане ставіць лату з новага неадбеленага палатна, і пра старыя мяхі, у якія ніхто не стане ўліваць маладое віно, каб адзенне і мяхі не парваліся, а віно не выцекла. Ісус навучаў, што паміж устаноўленым ім прынцыпам шчырасці намераў і старой абраднасцю нельга знайсці кампраміс, а пры ўсякай спробе спалучаць адно з іншым адразу ж выявіцца іх несумяшчальнасць [18, с. 224].

Адзначым, што практыка пасніцтва на той час не падлягала адмене. Багаслоў падкрэсліваў, што прымусіць прыняўшага ежу Месію наракаць было немагчыма цяжка, паколькі сам Ісус пасціўся 40 дзён і начэй добраахвотна [18, с. 387]. А вось змест пасту, яго напаўненне можа і павінна быць новым: «У пост чалавеку непрыстойна смуткаваць і рабіць пакаянныя жэсты, а неабходна тварыць дабро і любіць бліжняга, больш за тое, Ён загадаў выконваць пасты (58: 3) і святкаваць, асабліва ў суботу (56 : 1; 58 : 13) [18, с. 183].

Царкоўныя гісторыкі-багасловы Бауэр, Гарнак і Штраус − заснавальнікі «Цюбінгенскай школы». Яны былі перакананыя, што Новы Запавет, догматы і гісторыя Царквы павінны і далей разглядацца толькі з навуковага пункту гледжання, паколькі нельга зыходзіць толькі з тэалагічных перадумоў або абапірацца на веру. Прадстаўнікі «Цюбінгенскай школы» заклалі метадалагічныя асновы для разгляду Старога і Новага Запаветаў і ранняга хрысціянства з пазіцыі навукі і гісторыі.

Вынікі даследавання Штрауса знайшлі сваё прадаўжэнне ў Францыі ў працы, прысвечанай апісанню жыцця Ісуса, напісанай у форме рамана, усходазнаўцам і рэлігійным гісторыкам Э. Рэнанам. Гэта

першае факталагічнае вывучэнне жыцця Хрыста ў сучасным сэнсе, калі вехі з яго біяграфіі былі прызначаны не для прафесійных багасловаў, а для простых адукаваных грамадзян. Кніга карысталася вялікай папулярнасцю і да 1882 г. была перавыдадзена 17 разоў [19, с. 346].

У прадмове да кнігі аўтар адзначаў: «Я пісаў з мэтай выкласці мае думкі для тых, хто шукае праўду». Даследаванне выклікала як паток жорсткай крытыкі, так і шматлікія станоўчыя водгукі. Тэма пасніцтва ў выданні атрымала шматлікія каментарыі, дзе аўтар указваў на новае, адрознае ад іўдаізму прачытанне пасту, пры гэтым ён вылучаў два фактары. Так, у VII главе «Развіццё ідэі Ісуса пра Валадарства Божае» Рэнан падкрэсліваў, загартоўваючы фактар пасту для чалавечай прыроды Ісуса, паказваў, што ўсе глядзелі на яго знаходжанне ў пустыні Іўдзейскай як на падрыхтоўку да вялікіх подзвігаў... Ісус падпарадкаваўся гэтаму звычаю, прытрымліваючыся прыкладу сваіх папярэднікаў, і правёў сорак дзён у поўнай адзіноце, у строгім пасце, не маючы іншага суседства, акрамя дзікіх звяроў. Уяўленне вучняў працавала над яго знаходжаннем у пустыні [20, с. 122].

Другі фактар (прыняцце новага зместу пасту хрысціянамі) Рэнан асвяціў у главе XIV «Стаўленне Ісуса да язычнікаў і самарыцянаў». Ён адзначаў, што Ісус, будучы паслядоўным у сваіх поглядах, асуджаў тое, што не было рэлігіяй сэрца. Надуманыя абраднасці ханжэй (фарысеяў), на думку Рэнана, мелі ў асобе Ісуса смяротнага ворага. Пасту ён не надаваў асаблівай значнасці, але ставіўся з павагай да тых, хто замест ахвяры прыносіць прабачэнне крыўдам. Мы дарэмна сталі б шукаць у Евангеллі якіх-небудзь рэлігійных абрадаў, устаноўленых Ісусам. Хрышчэнне для яго мае другараднае значэнне, што ж тычыцца малітвы, то ён патрабуе толькі аднаго, каб яна была ад сэрца [20, с. 174]. На думку Рэнана, любоў да Бога, міласэрнасць, пост духоўны, узаемнае дараванне – закон Новага Запавету.

Рэлігійнае адраджэнне ў Англіі XIX ст. пачало ўзнікаць у колах універсітэцкіх інтэлектуалаў і багасловаў англіканскай царквы. Яго кульмінацыя − Аксфордскі рух. Ён задаў магутны багаслоўскі інтэлектуальны вектар англійскаму хрысціянству, якое ў гэты перыяд ператварылася ў ціхую, непатрабавальную, халодную, звыклую фармальнасць, у адзін з атрыбутаў развітога грамадства. На думку гістарыёграфаў, хрысціянства ў Англіі на рубяжы стагоддзяў «не мела ніякага дачынення да звышнатуральнага, не было ні набожнасці, ні гарачай дбайнасці і яшчэ менш містычнасці» [2, с. 322].

Сярод інтэлектуалаў, ініцыятараў рэлігійнага адраджэння быў Джон Кібл. У сваёй вядомай пропаведзі аб «Нацыянальным адступніцтве» (1833 г.) [21] ён жорстка крытыкаваў ліберальную палітыку парламента, які ўмешваўся ў рэлігійныя справы і аддаваў перавагу ідэалу секулярызаванай дзяржавы, што пагражала незалежнасці Царквы. Гэта пропаведзь Кібла лічыцца адпраўной кропкай Аксфордскага руху, адметнай рысай якога з'яўляўся традыцыяналізм. Багаслоўская праграма прапанавала звярнуць увагу на тэалогію ранняй Царквы і класічную англіканскую тэалогію XVI–XVII стст., таму вывучэнне прац Айцоў царквы заняло цэнтральнае месца ў англійскім багаслоўі. Па ініцыятыве аксфордцаў праводзілася вялікая праца па выданні царкоўных кніг (Library of Anglo-Catholic Theology, 88 тамоў, 1841−1866 гг.) [2, с. 322].

Да найбольш знакамітых яго прадстаўнікоў, акрамя Кібла, належалі Эдвард Пьюзо і Джон Г. Ньюман. Адзначым, што задачай Аксфордскага руху з'яўлялася не толькі багаслоўскае абгрунтаванне крытэрыяў сапраўднай Царквы, але і адраджэнне маральнасці і духоўнасці англічан. У гэтых адносінах можна без перабольшання лічыць, што служэнне Кібла, Пьюзо і Ньюмана было для сучаснікаў прыкладам маральнай чысціні, самаадданай працы і дабрачыннасці. У сваіх казаннях і даследаваннях, каментарыях да Святога Пісання і Святога Падання аксфордскія багасловы неаднаразова звярталіся да тэмы пасніцтва. У 1827 г. Кібл апублікаваў паэтычны цыкл «Хрысціянскі год» [22], што прынёс аўтару шырокую вядомасць, за яго ў 1831 г. ён атрымаў званне прафесара паэтыкі [23]. Так, багаслоў у даследаваннях прац Айцоў царквы акцэнтаваў увагу на адрозненне новазапаветнага пасту ад яго практыкі ў іўдаізме. Санет з цыкла твораў, які прысвечаны «Папяльцовай серадзе», ён пачынаў цытатай з Евангелля ад Мацвея (VI : 17,18): «А ты, калі пасціш, памаж галаву тваю і змый аблічча твае; каб з'явіцца посцячым не перад людзьмі, але перад Айцом тваім, Які таямнічы; і Айцец твой, Які бачыць тайнае, аддасць табе яўнае».

У санеце «Трынаццатая нядзеля пасля Тройцы» Кібл пацвердзіў фактамі разуменне пасту як глыбока асабістае і інтымнае – «пост Ён здзяйсняў у адзіноце, загорнуты ў нерухомае, цёмнае, цвёрдае воблака, абцягнутае вакол яго, як саван» [22]. Пры гэтым акцэнт у санетах ставіцца на духоўным складніку пасту: «Калі посцішся, не будзь маркотным, як крывадушнік, які дэманструе смутак з мэтай здавацца посцячым: хай апухлае вока забудзе слёзы, якія ў сэрцы знаходзяцца. Супакоіцца голас, ніякіх дрыготкіх вуснаў ці броваў. Бо чаму схаванае трэба ўказваць?» [22]. Кібл, ужыўшы форму санетаў, абгрунтоўваў і ўказваў на адрозненне фарысейскай традыцыі ад новазапаветнага разумення зместу пасту.

Розніцу пастоў у новазапаветнай і старазаветнай традыцыях маркіруе і Э. Пьюзо. Ён таксама атрымаў адукацыю ў Аксфордзе, там авалодаў старажытнымі мовамі, а ў 1828 г. стаў святаром, канонікам царквы Хрыста і прафесарам каралеўскай кафедры старажытнаяўрэйскай мовы ў Аксфордзе. Дзякуючы яго перакладам, англічанам сталі даступны сачыненні пакутніка Юстына, Тэртуліяна, свяшчэннамучаніка Кіпрыяна Карфагенскага, Свяціцеля Апанаса, благаслаўлёнага Аўгустына, Свяціцеля Іаана Златавуста і інш. Як навуковец ён быў шырока вядомы ў Еўропе, а яго даследаванні, грамадская дзейнасць у значнай ступені ўмацавалі Аксфордскі рух і надалі яму аўтарытэт. Вялікую ўвагу надаваў малады багаслоў вучэнню аб сакрамэнтах Царквы. У сваёй найбольш значнай працы «Дактрына праўдзівай прысутнасці: у тым выглядзе, у якім яна змяшчаецца у Айцах Царквы (ад смерці святога Яна Багаслова да Чацвёртага Сусветнага сабору), пацверджаная ў заўвагах да пропаведзі «Прысутнасць Хрыста ў Святой Эўхарыстыі», Пьюзо закрануў тэму пасніцтва. Там багаслоў каменціраваў і адзначаў істотнае адрозненне ад фарысейства новазапаветнай практыкі і традыцыі. Ён падкрэсліваў, што «шчырасць і чысціня» ў Новым Запавеце ўзаконьваліся і наканаваліся ім, становячыся

патрабаваннем і ўмовай. Аўтар, грунтоўна вывучыўшы тэксты Святога Падання, прыйшоў да пераканання, што «не Богаяўленне і не Вялікі пост робіць прыняўшых запаветы Хрыста паслядоўнымі хрысціянамі, але шчырасць і чысціня», напоўненыя радасцю [24].

Джон Генры Ньюман − прынцыповы прыхільнік хрысціянскага традыцыяналізму. Гісторыкі царквы адзначаюць, што ён не быў духоўным пісьменнікам у строгім сэнсе слова, паколькі не займаўся пытаннямі аскетыкі і містыкі ex pofesso, аднак у яго пропаведзях выяўлены каштоўныя прадбачанні, звязаныя з тэалогіяй духоўнага жыцця [4, с. 332].

Ньюман дэталёва праанализаваў тэксты новазапаветных дзеянняў Хрыста, каментарыяў да іх у працах Святога Падання. У сваіх даследаваннях і пропаведзях ён сцвярджаў і каменціраваў пасніцтва як вялікі хрысціянскі абавязак. Багаслоў падкрэсліваў: «...Ісус з'яўляецца ўзорам дасканалай чалавечай прыроды. Калі мы хочам быць дасканалымі, то абавязаны строга кіравацца ўчынкамі і запаветамі Хрыста, прызначанымі для нашага пераймання. Ісус блаславіў пост як сродак зычання дабра тым, што пасціўся сам» [25].

Ньюман, як і яго паплечнікі (Джон Кібл, Эдвард Пьюзо), лічыў, што прыклад Хрыста ўказваў на новы шлях да аксезы і пасніцтва, напаўнення іх духоўным пакаяннем. Ён спрабаваў надаць пакаянню новы змест, падкрэсліўшы, што гэта простая фармальнасць або папрокі сумлення, калі толькі яно не створана ў любові, як гэта было завешчана Ісусам. «Толькі тады нашы праведнасці прымальныя, калі яны здзяйсняюцца ў Хрысце, праз веру, але не шляхам закону, традыцыяй, прынятай фарысеямі» [25]. Багаслоў лічыў, што Ісус выкрываў фарысеяў: «Дарэмныя патрабаванні іх Закона, паколькі яны не напоўнены сілай Духа». У каментарыях тэкстаў Евангелляў Ньюман паказвае на значнае адрозненне пасту Ісуса ад традыцыйнага пасніцтва, асветленага ў кнігах Старога Запавету. Багаслоў так тлумачыў новы парадак: «Калі мы пасцім, не спалучаючы сябе ў сэрцы з Хрыстом, імітуючы Яго і молячыся за тое, каб Ён зрабіў наш пост сваім уласным, звязаў бы яго са сваім і перадаў яму дабрачыннасць Сваю, каб мы маглі быць у Ім, а Ён у нас; мы пасцім як яўрэі, а не як хрысціяне» [25].

Пост дзейсны толькі тады, калі ён праводзцца дзеля Ісуса. Ньюман дэталізаваў, што той, хто прыняў Новы Запавет Хрыста, дзівосным чынам стаў членам яго Запавету, сакрамэнтальным знакам Адзінага Нябачнага, Усюдыіснага Сына Божага, містычна паўтараючы ўсе дзеянні Яго зямнога жыцця: Яго нараджэнне, прысвячэнне, пост, спакусы, канфлікты, перамогі, пакуты, страснасць, смерць, Уваскрэшанне і Узнясенне. Гэта думкі, з якімі хрысціяне адзначаюць Каляды і Богаз'яўленне, гэта думкі, якія павінны суправаджаць нас праз Вялікі пост [25].

Аксфордскія багасловы настойвалі на каталіцкім і апостальскім характары Англіканскай Царквы, дэталёва паказвалі, што паміж ёй і пратэстанцкімі цэрквамі Еўропы – велізарная розніца. Англакаталіцызм першапачаткова быў накіраваны на абгрунтаванне пазіцый англіканства ў процівагу і пратэстантам, і каталікам, але з цягам часу ён салідарызаваўся з рыма-каталіцызмам.

*Заключэнне.* Такім чынам, тэорыя пазнання ў гэты перыяд стала базісам філасофіі. Мысліцелі размяжоўвалі навуку і веру, вывучалі прыроду ведаў і даследавалі іх кірункі, вылучалі аснову, сутнасць і ўзровень, якія кожнаму з іх уласцівыя. Прадстаўнікі заходнееўрапейскага багаслоўя, даследчыкі гісторыі хрысціянства пад ціскам лібералізму вымушаны былі шукаць адказы на выклікі часу. У палітычным супрацьстаянні канца XVIII – пачатку XIX ст. Каталіцкая Царква Еўропы змагла кансалідавацца, зарыентавацца і знайсці адзіна прымальнае рашэнне – вяртанне да евангельскіх запаведзяў, стабілізацыя і ўстанаўленне адзінства. Адзначым, што асновай унутранага жыцця Царквы заўсёды была вера, а яе знешняй апорай – адносіны з дзяржавай. У кола праблем, якія стаялі перад Царквой у XIX ст., уваходзілі адносіны веры і навукі, Царквы і дзяржавы, адзінства Царквы, цэнтралізацыя Царквы начале з Рымам. У такім гістарычным кантэксце заходнееўрапейскія багасловы, даследчыкі гісторыі хрысціянства былі вымушаны звяртаць увагу і вырашаць надзённыя праблемныя пытанні.

Даследаванне тэмы пасніцтва і аскетыкі ў гэты перыяд насілі фрагментарны характар, разглядаліся і праходзілі штрыхамі ў агульным кантэксце багаслоўскіх прац. Рыма-каталіцкія даследчыкі абаранялі артадаксальныя тэорыі, пры гэтым англіканскае багаслоўе падзяляла і прымала погляды каталікоў, але імкнулася да таго, каб пазбегнуць абмеркавання, паколькі бачыла ў іх павярхоўнае разуменне праблемы. Пратэстанскія гісторыкі хрысціянства, багасловы заклалі аснову знакамітай «Цюбінгенскай школы». У іх працах пераважалі тэмы, у якіх абгрунтоўваліся прыярытэты асабістай цікавасці і працэсы секулярызацыі. Яны былі перакананы, што Новы Запавет, догматы і гісторыя Царквы павінны і далей разглядацца толькі з пункту гледжання навукі, паколькі нельга зыходзіць з тэалагічных перадумоў або абапірацца толькі на веру. Прадстаўнікі «Цюбінгенскай школы» заклалі метадалагічныя асновы для разгляду Старога і Новага Запаветаў і ранняга хрысціянства з пазіцыі навукі і гісторыі. У кантэксце даследаванняў багасловаў тэма пасніцтва і аскезы папулярызавалася як пераарыентаванне духоўнага жыцця па форме і змесце. Варта падкрэсліць, што яго аснову складалі вучэнне, асабісты ўзор і Новы Запавет Ісуса Хрыста.


*Літаратура*

1. *Лортц, Й.* История Церкви (рассмотренная в связи с историей идей) : в 2 т. / Й. Лортц. – М. : Христианская Россия, 1999–2000. – Т. 2. : Новое Время, 2000. – 579 с.
2. *Хегглунд, Б.* История теологии / Б. Хегглунд – СПб. : Светоч, 2001. – 367 с.
3. *Шафф, Ф.* История Христианской Церкви : пер. с англ. / Ф. Шафф. – СПб. : Христианское общество «Библия для всех», 2007. – Т. 1. – 585 с.

*References*

1. *Lortc, J.* Istoriya Cerkvi (rassmotrennaya v svyazi s istoriej idej) : v 2 t. / J. Lortc. – M. : Hristianskaya Rossiya, 1999–2000. – T. 2. : Novoe Vremya, 2000. – 579 s.
2. *Hegglund, B.* Istoriya teologii / B. Hegglund – SPb. : Svetoch, 2001. – 367 s.
3. *Shaff, F.* Istoriya Hristianskoj Cerkvi : per. s angl. / F. Shaff. – SPb. : Hristianskoe obshchestvo «Bibliya dlya vsekh», 2007. – T. 1. – 585 s.

4. *Джордан Омэнн, О. Р.* Христианская духовность в католической традиции / О. Р. Джордан Омэнн. – Рим – Люблин : Изд-во Святого креста, 1994. – 416 с.
5. *Лебедев, А. П.* Церковная историография в главных ее представителях с IV века по XX / А. П. Лебедев ; под ред. М. А. Морозова. – СПб. : Алетейя, 2001. – 500 с. (Византийская библиотека. Исследования).
6. *Золотухин, В. В.* Философские теологии Фихте и Шеллинга в середине 1800-х годов: история несостоявшегося спора / В. В. Золотухин // Вестник Русской христианской гуманитарной академии. – 2013. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/filosofskie-teologii-fihte-i-shellinga-v-seredine-1800-h-godov-istoriya-nesostoyavshegosya-spora/viewer.
7. *Фихте, И. Г.* Система учения о нравах согласно принципам наукоучения; Наукоучение 1805 г.; Наукоучение 1813 г.; Наукоучение 1814 г. : пер. с нем. / И. Г. Фихте. – СПб. : Изд-во С.-Петерб. ун-та, 2006. – 619 с.
8. *Шеллинг, Ф. В.* Философия мифологии : пер. с нем. : в 2 т. / Ф. В. Шеллинг. – СПб. : Изд-во С.-Петербургского ун-та, 2013. – Т. 2. Монотеизм. Мифология. – 544 с.
9. Энциклопедический словарь. – Лейпциг : Ф. А. Брокгауз, Санкт-Петербург : И. А. Ефрон, 1890–1907. – Т. 8; 1892. – 479 с.
10. *Гегель, Г. В. Ф.* Философия религии : в 2 т. / Г. В. Ф Гегель. – М. : Ин-т философии АН СССР , Мысль, 1975. – Т. 1. – 532 с.
11. *Гегель, Г. В. Ф.* Работы разных лет : в 2 т. / Г. В. Ф Гегель. – М. : Ин-т философии АН СССР, Мысль, 1970. – Т. 1. – 668 с.
12. *Шлейермахер, Ф.* Речи о религии. Монологи : пер. с нем. / Ф. Шлейермахер. – М., 1911. (Приложение к журналу «Русская мысль»). Изд-во «Алетейя» (Санкт-Петербург).
13. де Гибер, Жозеф Духовность Общества Иисуса. Исторический очерк / Жозеф де Гибер, – М. : Ин-т философии, теологии и истории св. Фомы, 2010. – 680 с.
14. *Лойола, Св. Игнатий.* Духовные упражнения. Духовный дневник / Св. Игнатий Лойола, – М. : Ин-т философии, теологии и истории св. Фомы, 2006. – 376 с.
15. *Касавин, И. Т.* Герметизм, магия, натурфилософия в европейской культуре XIII–XIX вв. / И. Т. Касавин. – М. : Канон+, 1999. – 864 с.
16. *Гарнак, А.* История догматов / А. Гарнак. – М. : Public Domain, 1890. – 289 с.
17. *Гарнак, А.* Сущность христианства / А. Гарнак. – М. : Intrada, 2001. – 192 с.
18. *Штраус, Д. Ф.* Жизнь Иисуса : в 2 кн. / Д. Ф. Штраус. – М. : Республика, 1992 г. – 528 с.
19. Хроника христианства : пер. с нем. – М. : ТЕРРА, 1999. – 464 с.
20. *Ренан, Э. Ж.* Жизнь Иисуса : пер. с фр. / Э. Ж. Ренан. – М. : Политиздат, 1991. – 398 с.
21. *Кибл, Дж.* Национальное отступничество / Дж. Кибл // [Keble J. The Project Gutenberg eBook, National Apostasy Considered in a Sermon Preached in St. Mary's]. – Oxford. – Режім доступа: http://www.gutenberg.org/files/49112/49112-h/49112-h.htm. – Дата доступа: 01.09.2019).
22. *Кибл, Джон* Христианский год / Джон Кибл // [Keble J. The Project Gutenberg eBook, The Christian. Edited by Henry Morley]. – Режим доступа: http://www.gutenberg.org/ebooks/4272]. – Дата доступа: 01.09.2019.
23. *Соловьева, Т.* Оксфордское движение: борьба за церковное возрождение в Англии / Т. Соловьева // АиО – № 3 (25). – 2000. – Режим доступа: http://aliom.orthodoxy.ru/arch/025/frame.htm. – Дата обращения : 12.10.2019.
24. *Пьюзи, Э.* The doctrine the real presence, as contained in the fathers from the death of evangelist to the fourth general council, vindicated, in notes on a sermon, "The presence of christ in the holy eucharist," / Э. Пьюзи // University of Oxford. – Режим доступа: https://books.google.com.ag/books?id=T7IOAAAAIAAJ&pg=PA9-IA1&focus=viewport&hl=de&output=html_text. – Дата доступа: 1.10.2019.
25. *Ньюман, Д. Г.* Приходские и простые проповеди. Т. 6 / Д. Г. Ньюман. – Режим доступа: http://www.newmanreader.org/works/index.html. – Дата доступа: 19.10.2019.

4. *Dzhordan Omenn, O. R.* Hristianskaya duhovnost' v katolicheskoj tradicii / O. R. Dzhordan Omenn. – Rim – Lyublin : Izd-vo Svyatogo kresta, 1994. – 416 s.
5. *Lebedev, A. P.* Cerkovnaya istoriografiya v glavnyh ee predstavitelyah s IV veka po XX / A. P. Lebedev ; pod red. M. A. Morozova. – SPb. : Aletejya, 2001. – 500 s. (Vizantijskaya biblioteka. Issledovaniya).
6. *Zolotuhin, V. V.* Filosofskie teologii Fihte i Shellinga v seredine 1800-h godov: istoriya nesostoyavshegosya spora / V. V. Zolotuhin // Vestnik Russkoj hristianskoj gumanitarnoj akademii. – 2013. – Rezhim dostupa: https://cyberleninka.ru/article/n/filosofskie-teologii-fihte-i-shellinga-v-seredine-1800-h-godov-istoriya-nesostoyavshegosya-spora/viewer.
7. *Fihte, I. G.* Sistema ucheniya o nravah soglasno principam naukoucheniya; Naukouchenie 1805 g.; Naukouchenie 1813 g.; Naukouchenie 1814 g. : per. s nem. / I. G. Fihte. – SPb. : Izd-vo S.-Peterb. un-ta, 2006. – 619 s.
8. *Shelling, F. V.* Filosofiya mifologii : per. s nem. : v 2 t. / F. V. Shelling. – SPb. : Izd-vo S.-Peterburgskogo un-ta, 2013. – T. 2. Monoteizm. Mifologiya. – 544 s.
9. Enciklopedicheskij slovar'. – Lejpcig : F. A. Brokgauz, Sankt-Peterburg : I. A. Efron, 1890–1907. – T. 8; 1892. – 479 s.
10. *Gegel', G. V.* F. Filosofiya religii : v 2 t. / G. V. F Gegel'. – M. : In-t filosofii AN SSSR , Mysl', 1975. – T. 1. – 532 s.
11. *Gegel', G. V.* F. Raboty raznyh let : v 2 t. / G. V. F Gegel'. – M. : In-t filosofii AN SSSR, Mysl', 1970. – T. 1. – 668 s.
12. Shlejermaher, F. Rechi o religii. Monologi : per. s nem. / F. Shlejermaher. – M., 1911. (Prilozhenie k zhurnalu «Russkaya mysl'»). Izd-vo «Aletejya» (Sankt-Peterburg).
13. de Giber, Zhozef Duhovnost' Obshchestva Iisusa. Istoricheskij ocherk / Zhozef de Giber, – M. : In-t filosofii, teologii i istorii sv. Fomy, 2010. – 680 s.
14. *Lojola, Sv.* Ignatij. Duhovnye uprazhneniya. Duhovnyj dnevnik / Sv. Ignatij Lojola, – M. : In-t filosofii, teologii i istorii sv. Fomy, 2006. – 376 s.
15. *Kasavin, I. T.* Germetizm, magiya, naturfilosofiya v evropejskoj kul'ture XIII–XIX vv. / I. T. Kasavin. – M. : Kanon+, 1999. – 864 c.
16. *Garnak, A.* Istoriya dogmatov / A. Garnak. – M. : Public Domain, 1890. – 289 c.
17. *Garnak, A.* Sushchnost' hristianstva / A. Garnak. – M. : Intrada, 2001. – 192 c.
18. *Shtraus, D. F.* Zhizn' Iisusa : v 2 kn. / D. F. Shtraus. – M. : Respublika, 1992 g. – 528 s.
19. Hronika hristianstva : per. s nem. – M. : TERRA, 1999. – 464 s.
20. Renan, E. Zh. Zhizn' Iisusa : per. s fr. / E. Zh. Renan. – M. : Politizdat, 1991. – 398 s.
21. *Kibl, Dzh.* Nacional'noe otstupnichestvo / Dzh. Kibl // [Keble J. The Project Gutenberg eBook, National Apostasy Considered in a Sermon Preached in St. Mary\'s]. – Oxford. – Rezhim dostupa: http://www.gutenberg.org/files/49112/49112-h/49112h.htm. – Data dostupa: 01.09.2019).
22. *Kibl, Dzhon* Hristianskij god / Dzhon Kibl // [Keble J. The Project Gutenberg eBook, The Christian. Edited by Henry Morley]. – Rezhim dostupa: http://www.gutenberg.org/ebooks/4272]. – Data dostupa: 01.09.2019).
23. *Solov'eva, T.* Oksfordskoe dvizhenie: bor'ba za cerkovnoe vozrozhdenie v Anglii / T. Solov'eva // AiO – № 3 (25). – 2000. – Rezhim dostupa: http://aliom.orthodoxy.ru/arch/025/frame.htm. – Data dostupa: 12.10.2019).
24. *P'yuzi, E.* The doctrine the real presence, as contained in the fathers from the death of evangelist to the fourth general council, vindicated, in notes on a sermon, \"The presence of christ in the holy eucharist,\" / E. P'yuzi // University of Oxford. – Rezhim dostupa:: https://books.google.com.ag/books?id=T7IOAAAAIAAJ&pg=PA9-IA1&focus=viewport&hl=de&output=html_text. – Data dostupa: 1.10.2019).
25. *N'yuman, D. G.* Prihodskie i prostye propovedi. T. 6 / D. G. N'yuman. – Rezhim dostupa: http://www.newmanreader.org/works/index.html. Data dostupa: 19.10.2019.